

Быць лідарам — значыць браць адказнасць за лёс людзей, лічыць Дзмітрый Клімовіч

04.10.2023 - 12:24 Профсоюзный лидер

Старшыня Стаўбцоўскай раённай арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі Дзмітрый Клімовіч на сваёй пасадзе не так даўно — з лютага мінулага года. Аднак гэта той выпадак, калі якасці сапраўднага лідара відавочны адразу. І не трэба чакаць шмат гадоў, калі яны праявяцца. Падрабязнасці – у матэрыяле карэспандэнта “Настаўніцкай газеты”.



На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

Мы сустракаемся з Дзмітрыем Іванавічам акурат паміж двума настаўніцкімі святамі — Днём ведаў і Днём настаўніка. Жыццё гэтага чалавека падобнае на тысячы лёсаў беларускіх педагогаў і ўнікальнае адначасова.

Нарадзіўся Дзмітрый Клімовіч і жыве да гэтай пары ў вёсцы Апечкі Стаўбцоўскага раёна — родная зямля прывязала, нават прымагніціла яго да сябе. Да 9 класа вучыўся тут жа — у Апечкаўскай базавай школе, у старшыя класы давялося перайсці ў стаўбцоўскую (ці, як кажуць у гэтай мясцовасці, стаўпецкую. — *Заўвага аўтара.*) сярэднюю школу № 2, дзе на той час адкрыўся першы ў Беларусі педагагічны клас. У 1991 годзе будучы прафсаюзны лідар быў у ліку студэнтаў гістарычнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага, а скончыў у 1996 годзе ўжо Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка.

— Калі мы вучыліся ў гэтай установе адукацыі, то называлі адно аднаго танкістамі, — успамінае Дзмітрый Іванавіч. *— Пасля заканчэння педуніверсітэта (па спецыяльнасці я настаўнік гісторыі і нямецкай мовы) прыйшоў працаваць у сваю родную школу ў вёску Апечкі настаўнікам нямецкай мовы, змяніўшы сваю настаўніцу Ганну Пятроўну Шымко. Лічу, што мне пашанцавала з педагогамі, а на выбар спецыяльнасці паўплываў мой настаўнік гісторыі Іван Іванавіч Корсак.*

У 2006 годзе Дзмітрый Клімовіч вучыўся ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, дзе атрымаў дыплом па спецыяльнасці “Менеджмент у сістэме адукацыі”. У Апечкаўскай школе ён выкладаў да яе закрыцця, адкуль перайшоў на работу настаўнікам нямецкай мовы ў суседнюю Аталезскую сярэднюю школу. У снежні 2014 года быў прызначаны дырэктарам гімназіі № 1 Стоўбцаў, дзе працаваў да студзеня 2022 года. З лютага мінулага года ў жыццё Дзмітрыя Іванавіча ўсур’ёз і надоўга ўвайшоў галіновы прафсаюз.

Вучань

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

настаўнікаў Беларусі ў 1907 годзе. Мы там праводзім суботнікі, там Сямёнам Віктаравічам закладзена ліпавая алея — па дрэўцы ад маладзёжных саветаў кожнага раёна. У 2021 годзе майго настаўніка забраў COVID-19. Так склалася, што змяніў яго на гэтай пасадзе я. Працую і стараюся падтрымліваць тыя традыцыі, якія заклаў Сямён Віктаравіч.

Кіраўнік

Дзмітрый Клімовіч сціпла расказвае пра сваю штодзённую прафсаюзную работу. Ён лічыць, што прафкам — гэта своеасаблівы буфер паміж адміністрацыяй установы адукацыі і работнікам. У складзе Стаўбцоўскай раённай арганізацыі галіновага прафсаюза 2137 чалавек (лічбы на пачатак года). За бягучы год колькасць членаў прафсаюза крыху ўзрасла — нядаўна была ўведзена сярэдняя школа № 4 Стоўбцаў. Прафсаюз пільна сочыць, каб заработная плата работнікам сістэмы адукацыі выплачвалася ў вызначаны тэрмін і ў поўным аб'ёме.

— *Вялікая наша заслуга, што ў Стаўбцоўскім раёне ўсім работнікам сістэмы адукацыі за работу па кантрактай форме найму дадаткова даплачваюць 50 працэнтаў ад акладу,* — гаворыць Дзмітрый Іванавіч. — *Яшчэ за работу па кантракце работнік атрымлівае дадатковы дзень да адпачынку, а хацелася б, каб было 2—3 дадатковыя дні, бо максімальна Працоўны кодэкс дазваляе дадаваць 5 дзён. Лічу гэта выдатным вынікам сумеснай працы галіновага прафсаюза і мясцовых улад. Старшыня Стаўбцоўскага райвыканкама Дзяніс Сяргеевіч Колесень удзяляе надзвычай шмат увагі сістэме адукацыі.*

Сочым, каб настаўнікі атрымлівалі ўсе выплаты, якія ім прызначаны. Нядаўна мы атрымалі інфармацыю, што за навучанне дома настаўнікам павінна выплачвацца зарплата ў перыяд з 31 мая да 31 жніўня. Мінскі абкам галіновага прафсаюза накіраваў запыт у Міністэрства адукацыі, і мы атрымалі тлумачэнне на гэты конт. 13 нашым работнікам быў зроблены перараслік, і амаль 2000 рублёў было даплачана: 2 настаўнікам сярэдняй школы № 2 Стоўбцаў і 11 настаўнікам

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

райвыканкама Людміла Стонька і прафсаюзны лідар Дзмітрый Клімовіч. Ён, дарэчы, прызнаецца, што на такіх сустрэчах адразу звяртае ўвагу моладзі на магчымасць перайсці з працоўнага дагавора на кантрактную форму найму і атрымліваць даплату 50 працэнтаў да акладу. Калі іншагароднім маладым спецыялістам неабходна жыллё, хадайніцтва наконт прадастаўлення ім месца ў інтэрнаце накіроўваюць у філіял Мінскага маторнага завода, які працуе ў Стоўбцах. Моладзь таксама атрымлівае даплату ў памеры 2 базавых велічынь па прафсаюзных калектыўных дагаворах, кампенсацыю сродкаў за найм жылля. Такім чынам атрымліваецца зацікавіць моладзь работай у раёне: замацавальнасць маладых спецыялістаў — каля 80 працэнтаў. А яшчэ Дзмітрыя Іванавіча радуе, што выпускнікі педагагічных класаў стаўбцоўскіх школ актыўна выбіраюць прафесію настаўніка і вяртаюцца працаваць на радзіму.

— Стараемся агарнуць клопатам ветэранаў педагагічнай працы, віншуем іх са святамі. Мы ладзім у раёне святы вёсак, і за кошт сродкаў прафсаюза ветэраны сістэмы адукацыі на гэтых святах атрымліваюць падарункі. Прычым атрымліваюць іх усе ветэраны сістэмы адукацыі, уключаючы тэхнічных работнікаў, вартаўнікоў, качагараў, нават калі школа ўжо не працуе. Людзі адразу адчуваюць і цэняць гэтую ўвагу. І гаворка тут не пра кошт і памер падарунка — пра адносіны да чалавека, пра тое, што яго не забыліся, запрасілі на сцэну, каб аддзячыць за працу, — расказвае Дзмітрый Клімовіч. *— Арганізоўваем шмат экскурсій для педагогаў. Лічу, што педагогам карысныя такія паездкі па роднай зямлі, гэта добрая магчымасць пастасавацца з калегамі. Нашы настаўнікі пачалі актыўна ездзіць на аздараўленне ў санаторыі ФПБ. Карыстаецца попытам тур выхаднога дня, людзі цікавяцца, ці будуць такія туры ад прафсаюза ў найбліжэйшы час. Жартую, што скончым усе асеннія сельскагаспадарчыя работы, выкапаем бульбу і тады зноў паедзем адпачываць.*

Адказнасць за лёс людзей

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

Значыць, памятаюць.

— Што для вас быць прафсаюзным лідарам?

— Быць лідарам вельмі няпроста, бо на цябе глядзяць усе. А быць лідарам у такой буйной арганізацыі, як Беларускі прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі, — значыць быць узорам для сваіх калег, сваіх вучняў. Лідар бярэ на сябе адказнасць за лёс людзей і не мае права на памылку, асабліва ў сістэме адукацыі, калі любая памылка можа каштаваць вельмі дорага. Заўсёды ты павінен быць наперадзе, быць, так бы мовіць, рухавіком.

Наталля КАСТЭНКА
Фота Ксеніі РУБІН

Еще материалы рубрики

Настаўнік з Лунінца Юрый Швед: «Люблю быць у цэнтры падзей»

31.01.2024

Людміла Паддубіцкая: «Голас айчыннага галіновага прафсаюза ва ўсе часы быў моцным»

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

Што абумовіла прафесійны выбар і вяртанне на малую радзіму? Вопытам падзяліліся маладыя педагогі з Дуброўны

Проект по формированию имиджа педагога планируют расширить на все регионы

Паричской школе присвоено имя Андрея Пинчука

Особенный ребенок в семье: как педагогу взаимодействовать с родителями детей с ОПФР

Якія спецыяльнасці Смілавіцкага аграрнага каледжа найбольш папулярныя ў абітурыентаў, расказаў Віктар Маслак

АВТОРСКИЕ КОЛОНКИ

ИГОРЬ ГРЕЧКО

БЫЛЫХ НАСТАЎНІКАЎ НЕ БЫВАЕ



ИВАН ЖДАНОВИЧ

ГЭТЫМ ЗЯЛЁНЫМ ШЧЫТОМ...



ТАТЬЯНА БОНДОРЕВА

З'ЯДНАНЫЯ СКАРЫНАЎСКІМІ ДНЯМІ



2024 БЕЛАРУСЬ ГОД КАЧЕСТВА

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

ШКОЛА УПРАВЛЕНИЯ

На здоровый лад

Бесплатно привиться от гриппа предлагают в Беларуси

©2014-2024 Редакционно-издательское учреждение «Издательский дом «Педагогическая пресса»

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее